Ба 26805
БА 2580ф
8
2580

Ба 26805

М. Лермантаў.

# МЦЫРЫ

З расейскае мовы пералажыў

Краўцоў-Макар.

Выданьне газэты „Змаганьне“.

ВІЛЬНЯ
1924.
Друкарня С. Бэкэра.

Бел. аддзел
1994 г.
Інв. 1953 г.
Бэт 26805
бібліятэка імя Леніна

25. 04. 2009

Бзат 8/2580

М. Лермантаў.

# МЦЫРЫ.

160.994 / Б 2580

З расейскае мовы перакладу
**Краўцоў Макар.**

Выданьне газэты „Змаганьне“.

ВІЛЬНЯ
1924.
Друкарня С. Бэкэра.

бібліятэка імя Леніна

# Мцыры *)

I.

Няшмат гадоў таму назад
Там, дзе зыйшліся ў вадаспад
Адна з аднэй, як дзьве сястры,
Струі Арагвы і Куры,
Быў манастыр, дзе з-за гары
Й сягоньня бачыць пешаход
Стаўпы раскіданых варот
І вежы цэрквы й яе шчыт,
Што славай даўняю пакрыт,
Ды ня курыць ужо пад ім
Кадзільніцаў пахучы дым,
Нячутна сьпеву ў позьні час —
Малітвы інакаў за нас;
Цяпер адзін дзядок сівы,
Руінаў сторaж паўжывы,
Людзьмі і сьмерцяю забыт,

---

Мцыры — пагрузінску манастырскі паслушнік.

Зьмятае пыл з магільных пліт;
Там надпіс выбіты на іх
Аб славе часаў залатых,
Даўно мінулых. Ды аб тым,
Як, лёсам змучаны сваім,
Такі-то цар у пэўны год
Аддаў Расеі свой народ.

І сіла Божая зыйшла
На Грузію! — Яна цьвіла
З тае пары ў цяньку садоў,
З усіх заслонена бакоў
Мяжой прыяцельскіх штыхоў.

II.

У Тыфліс праз горны перавал
Расейскі ехаў гэнэрал;
Хлапца палоннага ён вёз.
Той зьнядужэў, не перанёс
Шляху далёкага трывог.
Ён меў гадоў каля шасьцёх;
Як сарна гор, пужліў і дзік,
Слабы і пруткі, як трысьнік;
Але страшэнны той нядуг

Разьвіў у ім магутны дух
Яго бацькоў. Бяз жальбаў ён
Таміўся. Й жаласьлівы тон
З яго губоў не вылятаў.
Знаком ён страву адхіляў
Ды ціха, горда паміраў.
Манаха літасьць памагла,
Што ў манастыр яго ўвяла,
Каб там ратунак ён знайшоў,
Хутчэй да памяці дайшоў.
Але сярод людзей чужых
Спачатку ён баяўся ўсіх,
Хадзіў адзін, маўчаў мо' з год
Ды паглядаў на родны ўсход,
Таміўся смутнаю тугой
Па роднай Грузіі сваёй.
Пасьля к палону ён прывык,
Загаварыў яго язык.
Чужую мову зразумеў,
Якой ніколі ён ня ўмеў,
Быў хрышчаны сьвятым айцом
І з шумным сьветам незнаём.
Падросшы, навет, думаў ён

Прыняць манашаскі закон,
Як раптам стуль сабраўся проч,
Як надыйшла васеньня ноч.
Па горах цёмны лес шумеў.
Тры дні ніхто знайсьці ня ўмеў
Таго хлапца. Пасьля знайшлі
Ды йзноў манахам аддалі.
Ен няпрытомны быў, худы,
Як быццам цяжкія труды
Альбо хваробу адцярпеў,
Сказаць нічога не хацеў.
Відочна кожны дзень ён сох,
Паздаравець ніяк ня мог.
І блізкі быў яго канец,
Калі прыйшоў стары чарнец,
Каб як яго угаварыць,
Духоўнай ласкай абдарыць.
І горда выслухаў яго,
Айца духоўнага свайго,
Грузінчык хворы. Уздыхнуў
Ды рэштай сілы зварухнуў,
Устаў крыху, сябе раскрыў
І доўга гэтак гаварыў:

III.

„Ты споведзь выслухаць маю
Сюды прыйшоў, — дык аддаю
Апошні дзякуй я табе—
У апошняй думак барацьбе.
Вось добра мне з табою быць,
Грудьмі палёгку захапіць.
Нікому не зрабіў я зла,
Праз гэта, чым душа жыла,
Няшмат карысьці вам пазнаць —
Душу-ж ці можна расказаць?
Пажыў я мала. Дый, яно,
Жыцьці два гэткіх за адно,
Але-ж паўнюткае трывог,
Я памяняў-бы, калі-б мог.
Я толькі думкі аднае
Уладу ведаў, вось тае,
Што, як чарвяк у мне жыла,
Душу спаліла й павяла
Адсюль, калі ня чулі вы,
У сьвет трывогі і бітвы.
Мне душна ў кельлях тут было —
Туды ўсё думкамі няслo

Да хмарай схованай скалы,
Дзе людзі вольны, як арлы.
Жаданьне гэта кожну ноч
Паліла вочы, гнала проч.
Я адкарміў яго тугой,
Яго прад небам і зямлёй
Цяпер я гучна прызнаю,
Апошні гымн яму пяю,
Адно яго найбольш люблю
І дараваць мне — не малю.

IV.

„Дзядулька! Чуў я ўжо няраз,
Што адлаліў ты сьмерці час —
Нашто? Забыты, адзінок,
Сарваны бураю лісток,
У вас я вырас на вачах
Душой дзіця — судзьбой манах.
Нікому я ня мог сказаць,
Як бацьку й маці трэба зваць.
Вядома, ты хацеў, старык,
Каб я вось тутака адвык
Ад гуку словаў тых зусім —

Дарма! я сьвет убачыў з ім.
Я ў іншых бачыць мог радню,
Айчыну й дом, што так цаню,
А сам заўсёды быў адзін
І навет мілых дамавін,
Ня толькі душ свае радне,
Не давялося знаці мне.
Тады бяз лішніх, горкіх сьлёз
Прысягу небу я прынёс,
Хоць міг адзін, калі-нібудзь,
Каб дружна раз хацяў ўздыхнуць
З душою блізкай да мяне
На мілай, роднай старане.
Ды жаль, што гэта ня жыве,
Сканаўшы ў поўным характве,
І я ў зямлі саўсім чужой
Памру рабом і сіратой.

## V.

Ня можа сьмерць мяне ўстрашыць,
Бо кажуць там пакута сьпіць
У халоднай вечнай цішыне.
А з жыцьцем жаль растацца мне.

Я вельмі-вельмі малады,
А ці-ж юнацкія гады
Калісь ты ведаў, ці забыў,
Як ненавідзеў ды любіў,
Як сэрца стукала мацней,
Блішчала сонейка ясьней.
Як пазіраў ты мо‘ калі
На залацістыя палі
З высокай вежы, што ў кутку,
Дзе часам, можа, ў халадку
У глыбокай шчэліне сьцяны,
Дзіця нязнанай стараны,
Туліўся голуб малады,
Каб там ня ведаці бяды?
Няхай табе благі ўжо сьвет,
Бо ты сівы, стары ўжо дзед.
І ад жаданьняў ты адвык,
Дык ці-ж бяда? Ты жыў, старык!
Ты маеш шмат чаго забыць,
Ты жыў — я такжа мог-бы жыць!

VI.

„І ведаць пэўна хочаш ты,
Што, вольны, бачыў я тады?

Навокал пышныя палі
На волі там. Пры іх былі
Узгоркі, ўкрытыя вянком
Лясочкаў, вырасшых кругом,
Шумеўшых сьвежай грамадой,
Так, як браты ў гульні сваёй.
На скалаў рой я паглядаў,
Калі ручай іх разьдзяляў,
Іх думкі хутка я згадаў:
Напэўна ведаю адно —
У паветры носяцца даўно
Абняцьці каменныя іх,
Ждучы спатканьня кожны міг.
Гады ляцяць, праходзяць дні —
Ды не сайдуцца век яны!
Я бачыў горныя хрыбты,
Бы мараў сон мой залаты,
Калі ў час ранешняй пары
Дыміліся, як аўтары
У сінявым небе іх вярхі
Й за аблачкамі аблачкі,
Адбыўшы тайны тут начлег,
На ўсход скіроўвалі свой бег —

Як быццам птушак караван
Ляцеў праз сіні акіян!
Здалёк я бачыў праз туман
У ясным сьвеце, як алмаз,
Сівы, магутны мой Каўказ —
І лёгка сэрцу маяму
Было, ня ведаю чаму.
Мне тайны голас гаварыў,
Што некалі і я там жыў.
І стала ў цамяці мацней
Мінулае ясьней, ясьней...

VII.

І спомніў бацькаўскі я дом,
Аул, рассыпаны кругом.
Пачуў я шум вячэрні й сьмех
І стады коняў тупат-бег,
Сабачы чуў далёкі брэх.
Я памятаў старых дзядоў,
Што ў часе відных вечароў
На ганачку сядзелі ў нас,
Аж покуль месяц не пагас.
Блішчалі похвачкі агнём
Даўгіх кінжалаў... ды як сном

Прайшло неяснаю чаргой
Усё так жыва прада мной.
А бацька мой? Ен быў жывым
У адзежы роднай. Баявым
Здаваўся мне. Я помніў гук
Яго кальчугі й ласку рук
І стрэльбы бляск. Жывы пагляд
Яго і сёстраў. І быў рад
З агністай сілы іх вачэй,
Як песьні іх гулі грамчэй
Над калыбелькаю маей...
Між гораў бег там ручаёк;
Яго чуваць было здалёк;
Туды на жоўценькі пясок
Гуляці часта я хадзіў,
За лётам ластавак сачыў,
Калі яны перад дажджом
Ваду трывожылі крылом.
І спомніў я наш ціхі дом,
Агонь вячэрні мілы ў ём,
Расказы доўгія аб том
Як там дзяды жылі даўней,
Калі быў сьвет яшчэ мілей.

## VIII.

„Ты хочаш ведаць, што рабіў
На волі я? Павер, што жыў.
І што жыцьцё бяз гэтых дзён,
Што прамігнулі, нібы сон,
Было-б тужлівей і сумней
Бясьсільнай старасьці тваей.
Даўно жаданьні ажылі
Пабачыць горы і палі
Мае радзімае зямлі;
Згадаць — для волі, ці турмы
На гэты сьвет прыходзім мы —
І ў позьні час, страшэнны час,
Калі пярун пужаў тут вас,
Калі гуртом пры аўтары
Упалі ўсе і ты, стары,
Я ўцёк тады. О! я, як брат
Абняцца з громам быў-бы рад!
Вачыма хмары я сачыў,
Рукой маланачку лавіў...
Скажы, між гэтых сумных сьцен,
Што вы далі-б мне на замен

Дружбы кароткае з дажджом,
Маланкай, бурай, Пяруном?...

IX.

„Бег вельмі доўга я. Куды?
І ведаць не хацеў тады.
Ні зоркі ў небе ня было;
Грудзей дыханьне ажыло,
Калі быў вольны я, адзін.
І гэтак шмат-такі гадзін
Я бег. Нарэшце крыху лёг,
(Бо далей бегчы ўжо ня мог),
Паміж высокае травы.
Паслухаў, можа беглі вы
За мной. Ды ведама, што не!
Пярун заціх. А ў вышыне
Бруіў бялявы сьвет струёй
Між цёмным небам і зямлёй.
І разьбіраў я, як узор
На ёй хрыбты далёкіх гор.
Спакойна, моўчкі, я ляжаў,
Шакаль часамі дзе пішчаў,
Начны трывожачы спакой.

Агніста блїснуўшы луской,
Паўзла па камені зьмяя.
Аднак душа тады мая
Ня знала жаху. Я быў рад,
Што й сам хаваўся, нібы гад.

X.

Унізе глыбока нада мной
Ручай, вадою дажджавой
Пабольшаны, гудзеў як рой,
Або, як сотня галасоў.
Хоць ня чуваць было мне слоў,
Аднак я мову чуў адну:
Маракаваньне ды вайну,
З каменнай грудаю сваей.
То раптам сьціхшы, то мацней
Гук гэты чуўся ў цішыне;
І вось ў мглістай вышыне
Гукнулі птушачкі і ўсход
Азалаціўся. Карагод
Санлівых красачак дыхнуў,
Лісточкі вецер зварухнуў.
Ды, як яны, спаткаўшы дзень,

Пакінуў я ранейшы цень,
Сваю падняўшы галаву,
Ды азірнуўся, дзе жыву?
Было мне страшна; на краі
Бяздоньня грознага струі
Дасюль, відочна, я ляжаў,
Сярдзіты вал мне пагражаў;
Праз скалы шлях туды зьбягаў
Ды толькі чорт ім пахаджаў,
Калі, сатрэсены з нябёс
Жыцьцё пад землю перанёс.

XI.

„Вакол мяне цьвіў Божы сад;
Расьлінаў радужны той рад
Хаваў сьляды нябесных сьлёз,
І кісьці вінаградных лоз
Круціліся паміж кустоў
Жывым зяленівам лістоў;
І купы ягадкаў на іх,
Бы шмат каменьняў дарагіх,
Гарэлі яркаю ігрой.
То птушкі цэлаю гарой
Іх абсядалі, быццам рой.



Бэлп 26805
Дв. 1953 г.
Бібліятэка імені Леніна

Ізноў на землю я упаў
Ды йзноў прыслухвацца пачаў
Да ўсіх чароўных галасоў,
Што там шапталі між кустоў,
Як быццам гутарку вялі
Аб тайнах неба і зямлі;
І ўсе прыроды галасы
Зьліліся там у гымн красы.
І ў той такі ўрачысты час
Нат' ня гукнуў ніводзін раз
Заціхшы голас там навек,
Што мае толькі чалавек.
Усё, шчо я прачуў тады,
Усе думкі (сьцёрты іх сьляды)
Хацеў-бы я хоць расказаць,
Каб думкай жыцьце іх пазнаць.
А неба ў час нядаўні той
Было так чыста раніцой,
Што можна вокам прасачыць,
Як ангел сьветленькі ляціць;
Так ясна, сьветла там было,
Бы неба землю абняло.
Я ў ім вачыма і душой

Тануў, пакуль гарачы зной
Мае задумы не прагнаў
І я вады ўжо зажадаў.

XII.

„Тады з гары да ручая
Спаўзаў удол па плітах я.
Ды за кусты хапаў, як мог,
А камень іншы раз з-пад ног,
Сарваўшыся, каціўся ўніз;
Зямля курэла. Пыл павіс
Радком. А камень паддзыгаў
І ў ручаі пасьля зьнікаў.
Між ручаём і вышынёй
Я павісаў над глыбінёй —
Ратунак моладасьць дала
І сьмерць нястрашнаю была!
Як толькі зьлез я з вышыні,
Пах вадзяное сьвяжыні
Мне проста ў вочы так і біў
І, колькі мог, ваду я піў.
Раптоўна голас—шум шагоў...
У момэнт зьнікшы між кустоў,

Нявольным жахам абняты,
Угару я глянуў праз кусты
Ды слухаў, бы акамянеў...
І блізка-блізка зазьвінеў
Грузінкі голас малады;
Такім жывым ён быў тады,
Салодкім, вольным, быццам ён
Навучан быў з даўных-давён
Імёны зваць толькі адны
Мае радзімай старany.
То песьня простая была,
Яна мне ў думку залягла.
І мне, як вечар надайдзе,
Нявідны дух яе гудзе.

XIII.

„І са збанком над галавой
Грузінка сьцежкаю вузкой
Ішла з гары тае крутой.
І сьмешна часам ёй было,
Што сьцежка сьлізкая, як шкло.
Адзежа простая на ёй
З назад закіненай чадрой

Была. І летняю жарой
Яе запалены быў твар
І грудзі. Моладасьці жар
Відаць шыбаў з губоў і шчок;
Пагляд вачэй так моцна цёк,
Каханьня поўны быў яе,
Аж думкі палкія мае
Астылі. Помню толькі я —
Зьвінеў збанок, калі струя
У яго ўлівалася. Пасьля
У кустох пачуў я шум гальля.
А калі я прачхнуўся зноў,
Ды адліла ад сэрца кроў,
Яна далёка ўжо была
І лёгка, хоць памалу йшла
Высока, стройна між кустоў,
Як топаль—цар яе палёў...
І блізка ў сьвежанькай імгле
На моцнай, роўненькай скале
Дзьве саклі, быццам прырасьлі
Да тэй каменнае зямлі.
Праз невялічкі камінок
Струіўся сіненькі дымок.

Ды мне цяпер яшчэ чувацъ,
Як дзьверы ціха там скрыпяць...
Ня зможаш ты, стары, пазнаць
Чаму ўва мне туга й нуда,
Дый калі-б мог—было-б шкада:
Мае ўспаміны не заснуць
Яны ўва мне, са мной памруць.

## XIV.

,,Праз цэлу ноч я так хадзіў
І вельмі змучаны ўжо быў.
У цяньку я лёг сабе й заснуў,
Мяне сон мілы агарнуў...
Абраз грузінкі маладой
Ізноў я ўбачыў. І нудой
Занылі грудзі мае зноў...
Але ад тых салодкіх сноў
Прачхнуўся я. І ўжо сьвяціў
У небе месяц. Як назьдзіў
Плыла і хмарачка адна,
Як быццам думала яна
Наш мілы месячык глынуць,
Каб цемрай землю агарнуць.

Быў ціхі й цёмны цэлы сьвет
І толькі дальні мой сусед
Ланцуг вяршынаў сьнегавых
Блішчаў на горах векавых
Ды берагі змываў ручай.
Агонь у саклі, зазвычай,
То вырастаў, то быццам гас:
У позны ўжо паўночны час
На небе гэтак іншы раз
Згасае ясная зара,
Бо адпачыць і ёй пара!
І як туды я ні хацеў,
Аднак зайсьці такі ня сьмеў,
Бо мэту толькі меў адну —
Прайсьці у родну старану.
Праз гэта-ж я і перамог
Цярпеньне голаду, як мог.
Дарогу простую знайшоў.
Нямы й пужлівы я пайшоў,
Куды—ня ведаю, па ёй
Ды хутка ў пушчы там лясной
З вачэй і горы я згубіў
І зразумеў, што заблудзіў.

## XV,

„Дарэмна моцна я злаваў,
Рукой расьліны ў лесе рваў.
А лес быў—вечны лес вакол,
Бы той вялізны частакол,
Штораз гусьцей ды ўсё крапчэй.
І міліёнамі вачэй
Глядзела ночы цемната
З галінкаў кожнага куста...
Ужо й галава балела мне
У бязьмежнай лесу гушчыне.
Хоць іншы раз на дрэва ўзьлез,
Пабачыць мог я толькі лес.
І тут упаў я на зямлю
Вось тую родну, што люблю —
Заплакаў жаласна тады
І грыз са злосьці, ці з бяды
Сырыя грудзі тэй зямлі.
І сьлёзы, сьлёзы пацяклі
У яе агністаю расой...
Ну, але-ж помачы людзкой
Ані тады я не жадаў,

Бо вас навек я пакідаў;
Чужы я людзям быў, павер,
Як той сьцяповы, дзікі зьвер.
Бажуся я табе цяпер —
Калі-б мяне ды здрадзіў крык,
Сабе я вырваў-бы язык.

XVI.

„У мае дзіцячыя гады
Ніразу, помніш ты, з бяды
Сьлязы ня ведаў я тады;
А тут я плакаў, як дзіця.
Хто-ж бачыць мог мяне? Хаця
Нямыя сьведкі маіх сьлёз:
Адвечны месячык з нябёс
Ды лес—магутны сын зямлі,
Здаецца, толькі і былі.
Заліта месячным сьвятлом,
Накрыта мохам ды пяском
Непарушальнаю сьцяной
Абцягнена, перада мной
Была палянка. Раптам цень
Па ёй сьлізнуў, бы ў ясны дзень,
І іскры нейкіх двох агнёў

Там заблішчалі міжы пнёў.
Пасьля з гушчару нейкі зьвер, —
Я помню гэта і цяпер, —
Адразу выскачыў і лёг.
Ніхто страшыць яго ня мог,
Бо ён быў—пушчы вечны госьць—
Магутны барс. Сырую косьць
Ён грыз і весела гурчаў;
То ўгору вочы запушчаў,
Ласкава круцячы хвастом,
На поўны месяц—і на ём
Шэрсьць зіхацела серабром.
Бітвы я ждаў. Рагаты сук
Якраз мне трапіўся да рук.
Я барацьбы й крыві, ня сьлёз
Тады жадаў... аднак-жа лёс
Мой іншым, іншым быў зусім...
Але цяпер я пэўны ў тым,
Што быў-бы я ў краі айцоў
Сярод найлепшых малайцоў.

XVII.

„Чакаў я. Й вось у цьме начной
Пачуў ён ворага; і ў бой

З ім рыхтавацца пачынаў,
Завыў працяжна, застагнаў;
Сярдзіта лапай драў пясок
Ды дуба стаў, пасьля прылёг,
Каб зьбіць мяне адразу з ног;
І ўжо шалёны мне скачок
Страшэннай сьмерцяю грaзіў...
Ды я-ж яго папярадзіў
І зьведаў сілу сваіх рук,
Бо, як сякера, моцны сук
Шырокі лоб яму расьцяў;
Як чалавек, ён застагнаў
Ды паваліўся. Але зноў,
Хаця й лілася з раны кроў
Шырокай, бойкаю струёй —
Бой закіпеў, сьмяртэльны бой!

## XVIII.

„Мяне за грудзі ён здушыў,
Але ўжо ў горла я ўсадзіў
І там два разы пакруціў
Мой сук рагаты. Зьвер завыў,
Рвануў тады, як толькі мог,

І разам мы упалі ўдвох,
Як гады сплёўшыся цясьней,
Абняўшыся у бойцы тэй
За двох прыяцеляў мацней.
І страшны ў лёганькай імгле
Бой разгарэўся на зямле.
Ой, страшны быў я ў гэты міг!
Хто зьлейшы быў тады з дваіх?
Як барс, я дзікі быў і злы,
Таксама дужы і ўдалы;
Гарэла ўся душа мая,
Як быццам сам радзіўся я
Ад дзікіх барсаў і ваўкоў
У лесе родных, сваякоў.
І быццам гутарку людзей
Запомніў я ды ўжо з грудзей
Радзіўся той жахлівы крык,
Як быццам змалку мой язык
Да іншых гукаў ня прывык...
Тут вораг мой пачаў слабець,
Паволі здрыгвацца, хрыпець,
Здушыў мяне апошні раз...
Прыйшоў яму сканаці час.

На міг агні яго вачэй
Сярдзіта бліснулі ярчэй,
Калі-ж упаў забітым ён,
Стуліў іх ціхі, вечны сон;
За колькі момантаў бітвы
Адважна ён спаткаў, жывы,
Спакой прызначаны мрацу.
Як і належыць малайцу.

XIX.

„Вось на грудзёх ты бачыш кроў,
Сьляды зьвярыных пазуроў;
Яны яшчэ не зарасьлі,
Сырая посьцілка зямлі
Сабой іх можа напаіць,
А сьмерць—навекі загаіць.
Запомніў я тады пра іх,
Сабраўшы рэшту сіл сваіх,
Хадзіў па лесу гушчыне...
Ды не змагчы ўжо лёсу мне:
Ен вечна зьдзекваўся з мяне.

## XX.

„Я выйшаў з лесу. Дзень пачаў
Будзіцца ўжо і пахаваў
Сабою зоркі ў вышыне.
І лес у сінім тумане
Загаварыў. Пасьля дымок
Аулу бачыў я здалёк.
Далінай вецер пралятаў,
З ім гук неясны прабурчаў...
Я сеў і ўслухвацца пачаў.
Але сьцішэў раптоўна дол.
І кінуў вокам я вакол:
Здавалася, што край я знаў,
Куды злы лёс мяне прыгнаў.
Было мне страшна. Зразумець
Ня мог я доўга, што сядзець
Ізноў вярнуўся я сюды —
У турму нядолі і бяды,
Што доўга так дарма таіў
Сваю я думку і пясьціў,
Цярпеў пакуту й ёю жыў
Дзеля чаго. У жыцьця расьцвет,

Каб, толькі глянуўшы на сьвет,
Пры гучным гомане дуброў,
Пазнаўшы шчасьце вольных сноў,
Забраць на іншы сьвет з сабой
Тугу па Грузіі сьвятой,
Згрызоту згінуўшых надзей
Ды сорам літасьці тваей!..
Яшчэ няпэўны, ці вастрог
Сапраўды зноў за свой парог
Мяне бярэ—й ці гэта ён?
Я думаў — гэта страшны сон...
Аж раптам вось знаёмы звон
Ізноў загуў у цішыне —
Усё стала ясным для мяне...
Ой, мігам я яго пазнаў!
Няраз з вачэй маіх зганяў
Ен радасьць вечных сноў жывых
Аб мілых, блізкіх і сваіх,
Аб дзікай вольнасьці сьцяпоў,
Аб сіле конскіх табуноў,
Аб бітвах, дзе і я гуляў
Ды часта ўсіх перамагаў!..
І слухаў я бяз сьлёз, бы сьніў,

Што сэрца нейкага званіў
Магутны звон; ды быццам хто
Udараў няведама зашто
Жалезам цяжкім па грудзёх.
І зразумець я смутна мог,
Што больш ніколі ў край дзядоў
Я не пабачу ўжо сьлядоў.

## XXI.

„Але! свой лёс я заслужыў!
Магутны конь праз сьцеп чужы,
Шпургнуўшы коньніка набок,
У родны край зусюль, здалёк
Кароткі, просты шлях знайдзе...
Ці-ж гэткі я? Ды дзе там-дзе?
Дарма з распаленых грудзей
Імкне жаданьне і туга —
На сьвет ім вырвацца нельга:
Бо гэта нейкі жар пусты,
Хваробай розум абняты.
На мне адбіла недарма
Пячатку чорную турма.
Вось гэткай, гэткаю якраз

Бывае красачка падчас
Вастрожная. Вось так яна,
Ля муру вылезшы адна,
Між плітаў мокрых не расьце
Ды чэзьне нияк, ня цьвіце,
Чакае сонцава сьвятла
Ды жыцьцядаўчага цяпла.
Прайшло шмат гэтак дзён яе,
Аж вось час лепшы настае:
Ужо нейка добрая рука
Забрала красачку з кутка.
У садочку ўжо яна была
У суседзтве з рожай. Расьцьвіла,
Аднак з усіх бакоў хаця
Там радасьць дыхала жыцьця,
Як толькі сонейка ўзыйшло,
Дык асмаліла, што цьвіло
Яшчэ ў красцы беднай той,
На сьвет народжанай турмой.

## XXII.

„І гэтак сама, як яе
(Ці чуеш словы ты мае?)

Паліў да дна, да караня
Агонь бязьлітаснага дня.
Дарма хаваў я у траву
Маю цяжкую галаву:
Засохшы ліст яе вянком
Цярнёвым над маім чалом
Сплятаўся; і у твар агнём
Сама зямля шыбала мне.
А нада мною ў вышыне
Ляталі іскры; а скала
Абнята параю была.
Ды навакол сьвет Божы спаў;
Як-бы ўсялякі гук прапаў.
Ну, хоць-бы конік чыркацеў,
Ці птушкі дзе пачуўся сьпеў,
Ці булькатаньне ручая? —
Вужаку толькі бачыў я:
Сухім шамоцячы кустом,
Ды жоўтым бліснуўшы хрыбтом,
Бы ўкрыты золатам клінок,
Сыпучы рыючы пясок,
Яна паволі там паўзла.
То роўна на пяску лягла,

Пагрэлася. То ў міг затым
Пярсьцёнкам зьбілася трайным;
То, як апарана, яна
Спакой трывожыла адна,
Усяляк круцілася вакол,
То ўдоўж цягнулася, як кол
І недзе гінула ў кустох.

XXIII.

„Й нічога я пачуць ня мог
Над галавой у вышыні.
Сярод ясьнеўшай цішыні.
Як-бы сястра каля сястры,
Здалёк чарнелі дзьве гары.
А манастыр наш з-за адной
Блішчаў зубшчастаю сьцяной.
Унізе Арагва ды Кура.
Абняўшы стужкай з серабра
Падошвы сьвежых астравоў,
Па каранёх жывых кустоў
Цяклі і дружна й весяло...
Да іх далёка мне было!

Хацеў я ўстаць, але ня змог,
Бо ўсё круцілася ў вачох.
Хацеў крычаць—язык сухі,
Што засушыў мой лёс ліхі,
Бязгучны й нярухомы быў...
Я паміраў. Мяне таміў
Нерадсьмяротны боль душы
І сярод дзікае глушы
Тады здавалася ўжо мне,
Быццам ляжу на мокрым дне
Глыбокай рэчкі—і была
Вакол таёмная імгла.
І чуў, як быццам, неяк я:
Бы лёд халодная струя
Мяне хацела захліснуць...
Баяўся я, каб не заснуць —
Так люба, лёгка было мне...
А нада мною ў вышыне
Гулялі хваляў грабяне.
Праз іх шкляную чыстату
Я бачыў сонца яснату,
Што зіхацела прыгажэй,
Куды за месячык ярчэй...

І рыбкі цэлай грамадой
Гулялі, ўцешаны вадой.
І вось адну я помню з іх:
Яна пры мне, сьмялей за ўсіх,
Хацела лашчыцца. Лузкой
Быў ушпіляны залатой
Яе хрыбёт. І доўгі час
Яна круцілася няраз
Саўсім нізютка нада мной,
Якраз над самай галавой.
І я вачэй яе пагляд
Лавіць шчасьлівы быў і рад
Ды надзівіцца я ня мог:
Яе срабрысты галасок
Мне рэчы дзіўныя шаптаў,
Сьпяваў, то зноў-жа заціхаў.
Ен гаварыў:
„Дзіця маё
Застанься тут са мной:
У вадзе тут вольнае жыцьцё
І холад і спакой.
„Я склічу сёстраў. Ды хутчэй
Мы дружнаю гульнёй

Разьвесялім тугу вачэй
І дух запаўшы твой.
„Засьні! Пасьцель твая, як пух,
Празрасты твой пакроў;
Прайдзе гадоў, сталецьцяў рух
Пад гоман мілых сноў.
„О, мілы мой! не затаю,
Што я цябе люблю,
Люблю, як вольную струю,
Як долю ўсю сваю...“.
„І доўга, доўга слухаў я;
І думаў: гучная струя
Зьлівала бег цякучы свой
Са словам рыбкі залатой.
Тут я самлеў. А Божы сьвет
Уваччу пагас. Гарачкі сьлед
Бязсільлю цела уступіў...

XXIV.

„Я знойдзен так і ўзяты быў...
А рэшту ведаеш ты сам,
Я скончыў. Вер маім славам,

Альбо ня вер, што мне з таго?
Баюся толькі аднаго:
Што труп нямы й халодны моїі
Ня будзе тлець ў зямлі сваёй
Ды повесьць горкіх мук маіх
Не прызаве між сьцен глухіх
Увагу й гора нічыё
На імя цёмнае маё.

## XXV.

„Бывай, айцец... дай руку мне:
Ці чуеш ты—мая ў агне...
Знай, гэты жар з юнацкіх дзён
У грудзёх маіх жыў, як закон,
Але цяпер канец яму,
І ён спаліў сваю турму,
І зноў ён ворнецца к Таму,
Хто ўсім законнаю чаргой
Дае пакуту і спакой...
Ды што мне ў тым? Хай у раі,
У сьвятым, завоблачным краі,
Мой дух знайдзе сабе прыпын...

А жаль! За некалькі хвілін
Між скалаў цёмных і крутых,
Мне вечна родных і сьвятых,
Дзе я дзіцём яшчэ гуляў,
Я-б рай і вечнасьць абмяняў!..

## XXVI.

„Калі пачну я паміраць —
І, вер, няшмат табе чакаць —
Дык прыкажы, каб занясьлі
Мяне ў садочак, дзе цьвілі
Акацый белых два кусты...
Між імі ёсьць мурог густы
І зіхаціць, як залаты,
На сонцы ліст. Вось там мяне
Вы палажэце. У вечным сьне
Бланкітным днём у гэты час
Уп'юся я апошні раз.
Адтуль-жа відны і Каўказ!
Быць можа ён з сваіх вярхоў
З зямелькі роднае дзядоў
Знак разьвітаньня мне прышле

Са сьвежым ветрам на чале...
Ізноў мо' там пачую я
Радзімы гук. Душа мая
Падумаць можа, быццам свой
Схіліўся нехта нада мной,
Закрыў руплівою рукой
Мне вочы згасшыя мае
І што ўпаўголасу пяе
Ен мне пра родну старану.
І з гэтай думкай я засну
Й нікога ўжо не пракляну!".

# Увага:

Цераз недахват у друкарні вялікай літары кароткага „У“, а таксама вялікага „ё“ выданьне выпушчана бяз гэтых значкоў ў тых месцах, дзе яны патрэбны.

Апрача таго ў кніжцы ёсьць гэткія карэктурныя памылкі:

| Стар. | НАДРУКОВАНА: | ТРЭБА ЧЫТАЦЬ: |
|---|---|---|
| 16. | X разьдзел, 6-ты радок зьнізу: І вось ў мглістай вышыне | І вось у мглістай вышыне |
| 30. | XX разьдзел, 1-шы радок зьнізу: Дзеля чаго. | Дзеля чаго? |
| 39. | XXV разьдзел, 6-ты радок зьнізу: І зноў ён ворнецца к Таму, | І зноў ён вернецца к Таму, |

1964 – 

Бел. едд.зол
1994 г.

B00000027374 1Б

Б/